№№167–168
(2895–2896)

6 лістапада 2008 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...

Якуб КОЛАС

Народная Воля

Да ўвагі!
Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Шаноўныя чытачы!
Па пытаннях распаўсюджвання газеты жыхары сталіцы могуць звяртацца па тэлефоне 328-63-93, усе астатнія — па тэлефоне 328-68-71.

БЛІЦ

У адным з мінулых нумароў "Народная воля" паведаміла, што грамадскі актывіст з Клецка Сяргей Панамароў распачаў збор подпісаў грамадзян пад зваротам да Аляксандра Лукашэнкі з просьбай не балатавацца на чацвёрты тэрмін у прэзідэнты Рэспублікі Беларусь.

Як паставіліся да гэтай ініцыятывы лідэры апазіцыйных партый? Падтрымалі альбо не?

Як вы ставіцеся да ініцыятывы Сяргея Панамарова?

Павел СЕВЯРЫНЕЦ,
старшыня аргкамітэта па стварэнні партыі "Беларуская хрысціянская дэмакратыя":

— Ініцыятыву, канешне ж, падтрымліваю, хаця не спадзяюся, што Лукашэнка прыслухаецца да меркавання спадара Панамарова і часткі беларускага народа. Але казаць і нагадваць — трэба. Таму падпішуся сам і, спадзяюся, падпішуцца многія нашы суайчыннікі. Бо насамрэч за 15 гадоў краіна — разбураная, мараль — разбураная, мова і культура — зруйнаваныя. І Лукашэнку трэба сыходзіць. Беларуская гісторыя не даруе яму чацвёрты тэрмін.

А што тычыцца апазіцыі, то, на жаль, выніку яе працы сёння няма. Найбольшыя дасягненні апазіцыі датуюцца часамі 15—20-гадовай даўніны, калі быў Беларускі нацыянальны рух. Пакуль, на жаль, назіраецца раздробленасць нацыянальнага руху, камуністы ў сіле, і мы маем, што маем...

Сяргей КАЛЯКІН,
першы сакратар ЦК Партыі камуністаў Беларускай:

— Пачну з апошняга: калі палітычная апазіцыя не марыць пра тое, каб стаць уладай, то гэта ніякая не апазіцыя. Безумоўна, перад намі стаіць задача змяніць уладу.

А што тычыцца збору подпісаў, то ініцыятыва цікавая, але я не веру ў яе эфектыўнасць. Не веру, што будзе шмат подпісаў сабрана і што наогул подпісамі можна прымусіць Лукашэнку не ўдзельнічаць у будучых прэзідэнцкіх выбарах. Калі нічога не здарыцца, Лукашэнка абавязкова пойдзе на чарговыя выбары...

Лявон БАРШЧЭЎСКІ,
старшыня Партыі БНФ:

— Зборы подпісаў ужо праводзіліся не адзін раз, і Лукашэнка ўсе гэтыя звароты ігнараваў. Немагчыма мабілізаваць людзей на подпісы, калі яны не бачаць рэальнага выхаду з сітуацыі. Наўрад ці многія вераць, што Лукашэнка, атрымаўшы ліст з подпісамі грамадзян, адмовіцца балатавацца на чацвёрты тэрмін. Дый у арганізацыйна-тэхнічным плане гэта ідэя вельмі няпростая. У нас было многа падобных ініцыятыў, але ўсе яны невядома чым скончыліся. Таму я скептычна да гэтага стаўлюся. Лічу, што трэба мяняць выбарчую сістэму і наносіць паражэнне ўладзе на выбарах.

Юрась БЕЛЕНЬКІ,
намеснік старшыні Кансерватыўна-Хрысціянскай Партыі — БНФ:

— Подпісы грамадзян — гэта паказчык грамадзянскай пазіцыі. Паказчык таго, што людзі, нягледзячы на магчымыя рэпрэсіі, не баяцца выказаць сваю пазіцыю. Але падобнымі акцыямі нельга злоўжываць. І яны не павінны праводзіцца часта: людзі стамляюцца і часам губляецца вастрыня ідэі. У даным выпадку я не лічу, што гэта ёсць нейкая патрэбная з'ява. Лукашэнка — чалавек, пастаўлены Масквой. Масква яму загадвае, што рабіць, і ён выконвае яе волю. Таму з гэтага пункту гледжання акцыя проста не мае сэнсу.

Калі казаць пра тых людзей, якія ў свой час публічна заявілі, што займаюцца палітбізнесам, то наша партыя заўжды вельмі рэзка выступала і выступае супраць такога. Мы лічым, што гэта вельмі разбуральная з'ява для беларускай палітыкі, для беларускай дзяржавы, для перспектывы ў бок развіцця дэмакратыі, адраджэння нацыянальнай дзяржавы. Гэта карупцыя ў палітыцы. Людзі зарабляюць грошы на народнай бядзе. І не важна, з якога яны боку — ці з боку Лукашэнкі, ці з боку створанай рэжымам з дапамогай Бруселя і Масквы псеўдаапазіцыі...

Алесь ЛАГВІНЕЦ,
памочнік экс-кандыдата ў прэзідэнты Беларусі А.Мілінкевіча:

— Гэта ініцыятыва, якая заслугоўвае ўвагі, але цяжка чакаць, што яна будзе агульнанацыянальнай. На маю прыватную думку, лепш было б канцэнтравацца на іншых асобах і дзеяннях, чым надаваць увагу асобе, якая і так дамінуе ў нашай палітычнай прасторы...

Анатоль ЛЯЎКОВІЧ,
старшыня Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі:

— Я вітаю любыя ініцыятывы, а вось безініцыятыўнасць не падтрымліваю. Іншая рэч, наколькі ўсё эфектыўна атрымаецца...

Калі адказваць на другое пытанне, то, на мой погляд, Лукашэнка, канешне, даволі важны суб'ект у нашым грамадстве, але праблема не толькі ў ім. Праблема менавіта ў нашай грамадзянскай супольнасці і геапалітычным раскладзе карт. Заўтра можна памяняць Лукашэнку, але сітуацыя можа пагоршыцца...

Марына КОКТЫШ.

ДЗЯДЫ, ДЗЯДЫ, БУДЗЬЦЕ З НАМІ!

Мы чуем іх галасы — галасы нашага сумлення

Кожны год "Дзяды" ў Курапатах — падзея вельмі хвалюючая, вельмі значная для душы. Кожны год у жалобнага дня, калі па даўняй народнай традыцыі ўшаноўваецца памяць продкаў, пры знешнім, на першы погляд, падабенстве свая адметнасць. І гэтым разам 2 лістапада, калі жыхары і госці Мінска ўжо ў дваццаты раз выйшлі на Курапацкі шлях, адчувалася нешта незвычайнае. Упершыню, дзякуй Богу, ніякія прыгоды-перашкоды не супынялі ўрачыстае шэсце; не азмрочвалі настрой, як раней, пагрозлівымі крыкамі-забаронамі шматлікія міліцыянты. Іх амаль не было відаць. І людзі нарэшце змаглі спакойна-ўрачыста, з ціхай удумнасцю і прасветленасцю на тварах, прайсці па вуліцах сталіцы да святых магіл, пакланіцца закатаваным нелюдзямі дзядам і прадзедам, вядомым і безыменным землякам, што ляжаць пад шатамі соснаў не толькі ў Курапатах, а і ў іншых мясцінах Мінска, усёй Беларусі і на абшарах былой камуністычнай імперыі.

Што ж збірае людзей разам у такі дзень, не дае ім забыць тое, што не падлягае забыццю, ды абмінае абыякавых? Гэта цікавіць мяне больш за ўсё.

Яшчэ не дайшоўшы да месца збору ля Гадзіннікавага завода, даганяю жанчыну з цэлым бярэмем кветак.

— Як жа можна было не прыйсці? — здзіўляецца майму пытанню спадарыня **Ала Гуцава**. — Ніводнага шэсця не прапускаю: згубіш памяць —дык усё згубіш, і будычыні не будзе. Без веры ў добрае і ўдзячнасці тым, хто загінуў дзеля нас, не пражыць.

Насустрач — з маладой, на ўвесь твар усмешкай (а ўжо 82!), рухавы, хоць і з неразлучнай кульбакай, **Павел Васільевіч Іваненка**, з якім мы яшчэ на самым пярэдадні "Дзядоў", у суботу 1 лістапада, бачыліся ў Курапатах.

— Ну, не ўседзеў, трэба ж было глянуць, ці ўсё ў парадку перад сённяшнім святам. Потым яшчэ паспеў на Усходнія могілкі — там прыхільнікі Кансерватыўна-Хрысціянскай партыі ўскладалі кветкі на магілы Васіля Быкава, Уладзіміра Караткевіча, Пімена Панчанкі, Міхася Ткачова, Генадзя Карпенкі. А цяпер — зноў да Курапатаў на паклон, там і за сваіх родных, пакутнікаў нечалавечай улады, памалюся.

Маладая прыгожая пара — студэнтка БДУ **Алеся Куневіч** і рабочы кандытарскай фабрыкі **Яўген Каросцік** — з бел-чырвона-белым сцягам прыехалі з Маладзечна.

Яна:

— Раней з бацькамі на шэсце прыязджала, яны ў мяне свядомыя людзі *(смяецца)*. Сама многа чытаю, расшукваю гістарычныя матэрыялы. Курапаты — гэта ж такая старонка ў нашай гісторыі, што яе не загарнуць.

Ён:

— Мне бацька расказваў пра незабыўную сустрэчу з Зянонам Пазьняком, калі той прыязджаў у Маладзечна і падарыў яму кнігу "Курапаты". Чытаю-перачытваю яе, і аж звон у душы. Ад бацькі ж — а ён заўзяты краязнаўца — у мяне цікавасць да таго, што было на гэтай зямлі, і любоў да роднай мовы, яшчэ з дзетсадаўскай пары...

Васьмігадовая **Настуля Барткевіч**, што прыйшла з бабуляй **Валянцінай Васільеўнай** і дзядулем **Віктарам Максімавічам Фурманамі**, можна скажаць, ужо "ветэранка". З трох гадкоў з сям'ёй праходзіць увесь маршрут шэсця — а гэта больш за 10 кіламетраў — сваімі ножкамі, расце пад бел-чырвона-белым сцягам:

— І зусім ісці не цяжка! Я ўжо вялікая, у другім класе беларускай гімназіі вучуся. Буду дапамагаць дзеду несці сцяг.

Уладзімір Данілавіч Папека-Басалай, стары чалавек з нязбытным болем у вачах (сустрэла яго ўжо ў Курапатах ля Крыжа "Пакутнікам Беларусі"), трымае ў дрыжачых руках паперчыну аб рэабілітацыі ягонага бацькі Данілы Рыгоравіча:

— Мне сем гадкоў было, а помню: уварваліся ў хату нейкія чужыя людзі, усё перавярнулі дагары нагамі і па падлозе валаклі бацьку. Маці лямантавала, я плакаў, учапіўшыся за яе прыпол. Больш мы яго не бачылі. І ад бацькі засталася толькі гэтая паперка: *"Причина смерти: расстрел... Расстрелян 18 марта 1938 г. в Минске"*. Хіба калі дарую катам? Хай будуць яны вечна клятыя. А дзяржава, выходзіць, даравала, раз маўчыць.

Да нашай размовы далучаецца 88-гадовая **Ніна Дзмітрыеўна Самухіна** з такім жа гаротным лёсам. Укрыла плечы нашым сцягам, стала на калені ля Крыжа. Запаліла свечку, палажыла хрызантэмы, стала маліцца.

— Сэрца баліць і баліць: што ж нарабілі бандыты бальшавіцкія з народам! Усю сям'ю нашу сялянскую — каго на смерць, каго на высылку. Мама і старэйшая сястра, неяк уратаваўшыся, доўга пад чужымі імёнамі хаваліся, і я мусіла называць іх "цёткамі"!.. Але ж праўда ўсё роўна выйшла.

(Заканчэнне на 3-й стар.)

Аляксандра Лукашэнку могуць запрасіць у Брусель, калі...

Кіраўнік Беларусі Аляксандр Лукашэнка можа быць запрошаны ў 2009 годзе на адзін з самітаў Еўрасаюза ў Бруселі. Пра гэта паведамляе "РИА Новости" са спасылкай на бельгійскія СМІ.

У прыватнасці, такую магчымасць агучыў у прэсе намеснік міністра замежных спраў Чэхіі Томас Пояр, які 24 кастрычніка наведаў з аднадзённым рабочым візітам Беларусь. Паводле яго слоў, кіраўніцтва Чэхіі, якой Францыя перадасць ратацыйнае старшынства ў ЕС з 1 студзеня 2009 года, разглядае варыянт магчымага ўдзелу беларускага прэзідэнта ў саміце ЕС, які пройдзе ў фармаце "27 плюс 6": краіны — члены ЕС плюс Грузія, Арменія, Азербайджан, Украіна, Малдова і Беларусь.

ЦВК спаганяе грошы з кандыдатаў у дэпутаты, што паздымалі свае кандыдатуры

Цэнтрвыбаркам пачаў спаганяць грошы з былых кандыдатаў у дэпутаты, якія зняліся з выбараў у Палату прадстаўнікоў.

Нагадаем, кожны з кандыдатаў атрымаў на выраб агітацыйных матэрыялаў 1 мільён 700 тысяч рублёў. Паводле закона гэтыя грошы яны мусяць вярнуць. Лідзія Ярмошына сцвярджае, што з выбараў зняліся 22 чалавекі.

Адну з першых позваў у гэтай справе атрымаў Канстанцін Жукоўскі з Гомеля. Буда-Кашалёўская акруговая выбарчая камісія падала ў суд на актывіста хрысціянска-дэмакратычнага руху. Судовае разбіральніцтва прызначана на 17 лістапада.

Як паведамляе БелаПАН, Жукоўскі перакананы, што суд возьме бок улады, таму на наступных выбарах мае намер плаціць за агітацыю толькі ўласнымі грашыма, каб улада больш "не магла яго беспадстаўна ганьбіць".

ЧУЛІ?

Да канца года штомесяц будуць даражэць хлеб і малочныя прадукты

Павышаны межавыя адпускныя цэны на хлеб, малако і мяса на IV квартал 2008 года. Як паведаміла прэс-служба Міністэрства эканомікі, такое рашэнне ўтрымліваецца ў пастанове гэтага ведамства №199.

Межавыя адпускныя цэны на хлеб і хлебабулачныя вырабы ў Беларусі ў IV квартале будуць павялічвацца на 2% штомесяц, на малако, кефір, смятану, тварог — на 2,5%. Акрамя гэтага, з 22 кастрычніка павялічаны межавыя адпускныя цэны на ялавічыну і свініну на 5% і 4% адпаведна. У лістападзе цэны на гэтую прадукцыю таксама ўздымуцца на 5% і 4%.

У прэс-службе патлумачылі, што чарговае павышэнне адпускных цэн ініцыявана Мінсельгасхарчам, аблвыканкамамі і Мінгарвыканкамам і абумоўлена падаражэннем кошту сельгассыравіны, павышэннем цэн на паліўна-энергетычныя і матэрыяльныя рэсурсы, а таксама стратнасцю і нізкай рэнтабельнасцю вытворчасці сацыяльна значных харчовых тавараў. Між іншым, у нашага Мінэканомікі заўсёды ёсць тлумачэнне для павышэнння цэн, тым часам, як у іншых краінах усё часцей аналагічныя ведамствы рапартуюць пра іх зніжэнне.

Марына НОСАВА.

Ці прыме Сяргей Абламейка на працу Аляксандра Казуліна?

На мінулым тыдні зышоў з пасады рэктара БДУ Васіль Стражаў. Галоўную ВНУ краіны ўзначаліў вядомы навуковец, доктар навук Сяргей Абламейка.

Сёння мы не будзем гадаць, чаму Аляксандр Лукашэнка адправіў у адстаўку рэктара Стражава. Знешне быццам бы нараканняў на працу Стражава з боку ўлад не магло ўзнікаць. Студэнты апошнім часам галасавалі як трэба, а не так, як пры А.Казуліне, калі ў 2001 годзе на адным з выбарчых участкаў А.Лукашэнку падтрымалі ўсяго 18 працэнтаў студэнтаў і выкладчыкаў, а на другім - 20 працэнтаў. І ў акцыях апазіцыі універсітэцкая моладзь не ўдзельнічала больш, чым студэнты іншых ВНУ. Па адной з версій, прычына адстаўкі Стражава — яго ўзрост. У наступным годзе ён адзначыць свой 65-гадовы юбілей, а згодна з Законам аб дзяржслужбе гэта крайні ўзрост для кіраўніцтва дзяржустановай. Але юбілей у Стражава толькі ў ліпені 2009 года, ды і працоўны кантракт з ім быў заключаны да лютага наступнага года. Акрамя таго, прыкладаў, калі ўзрост не перашкаджаў займаць высокія пасады, у сучаснай Беларусі досыць...

Аднак хацелася б звярнуць увагу на іншы момант. Васіль Стражаў кіраваў універсітэтам 5 гадоў. Ён заняў рэктарскае крэсла ў 2003 годзе пасля гучнай адстаўкі з гэтай пасады тагачаснага кіраўніка БДУ Аляксандра Казуліна. Тады Казуліну нават не пакінулі чвэрць стаўкі выкладчыка, ён вымушаны быў звольніцца з універсітэта, які менавіта ў часы яго рэктарства перажываў уздым.

Дарэчы, у свой час менавіта Казулін падставіў плячо Васілю Стражаву. У 2001 годзе Стражаў быў зняты з пасады міністра адукацыі і некаторы час заставаўся без працы. Менавіта да тагачаснага рэктара БДУ Казуліна ён і звярнуўся з просьбай аб працаўладкаванні. Спачатку былы міністр узначаліў Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы, які ўваходзіў у склад Беларускага дзяржаўнага універсітэта, а потым стаў дарадцам рэктара Казуліна. Аднак Стражаў пра гэта, мабыць, забыў, калі прафесара Казуліна знялі з пасады рэктара. Не працягнуў былы калега руку дапамогі.

Цікава, а як бы павёў сябе рэктар Сяргей Абламейка, калі б прафесар Казулін сёння звярнуўся да яго з заявай аб працаўладкаванні?

— Які сэнс ставіць у нязручнае становішча новага рэктара? — кажа Аляксандр Казулін. — Зразумела, што не ён вырашае гэтае пытанне. Сёння не толькі мяне, але і маіх дачок наймальнікі баяцца прымаць на працу. Я зараз шукаю магчымасць працаўладкавацца не на радзіме.

— А вы, Аляксандр Уладзіслававіч, усё ж звярніцеся да спадара Абламейкі...

На такі пасаж спадар Казулін нічога не адказаў. Але, адчуваецца, можа здарыцца, што і звернецца ён з адпаведнай просьбай да Сяргея Абламейкі...

Глядзіце, хто прыйшоў

У навуковых колах новы рэктар БДУ Сяргей Абламейка — постаць вядомая. Доктар навук, прафесар. У 26 гадоў ён абараніў кандыдацкую дысертацыю, у 34 — доктарскую. Апублікаваў больш за 350 навуковых прац, у тым ліку 11 манаграфій. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі.

У свой час Сяргей Абламейка скончыў матэматычны факультэт БДУ. З 2002 года ён узначальваў Аб'яднаны інстытут праблем інфарматыкі Нацыянальнай акадэміі навук. Але Сяргей Абламейка — акадэмічны вучоны, ён не быў звязаны з вышэйшай школай Беларусі. Пад яго началам у Інстытуце праблем інфарматыкі знаходзілася ўсяго толькі 180 чалавек. У БДУ навучаецца больш за 25 тысяч студэнтаў і працуе болей за 9 тысяч супрацоўнікаў. "Ён не гаспадарнік і не менеджэр. Ён навуковец", — так ахарактарызаваў новага рэктара БДУ былы старшыня Акадэміі навук Аляксандр Вайтовіч.

Аляксандр Лукашэнка, прызначаючы Сяргея Абламейку на пасаду рэктара, канкрэтна акрэсліў яго задачы. *"Універсітэт павінен сам зарабляць грошы, у тым ліку і вытворчасцю канкрэтнай прадукцыі"*, — заявіў Лукашэнка. Хацелася б нагадаць, што фармальна ў 2003 годзе Аляксандр Казулін быў адпраўлены ў адстаўку менавіта таму, што некаторыя структуры БДУ актыўна зараблялі грошы. Тады нават была ўзбуджана крымінальная справа ў дачыненні кіраўніцтва "Унідрагмет БДУ", аднак да суда яна так і не дайшла. У следчых не атрымалася даказаць, што кіраўнікі "Унідрагмета БДУ" кралі грошы, супрацоўнікам Следчага камітэта МУС нават прыйшлося папрасіць у іх прабачэння. Але гэтая гісторыя не магла не паўплываць на дзейнасць навукова-вытворчых падраздзяленняў БДУ.

Вольга ГРЫНЯВІЦКАЯ.

СОСЕДИ

Непогода помешала вице-премьеру Польши прибыть в Минск

Вице-премьер правительства Польши, министр экономики Вольдемар Павляк не смог прибыть в Минск для участия в Белорусско-польском экономическом форуме "Добрососедство" из-за нелетной погоды.

Об этом сообщает "Интерфакс" со ссылкой на посла Польши в Беларуси Генрика Литвина.

"Вице-премьер практически три часа прождал в аэропорту. После этого было принято решение отменить визит, так как время возможного прилета уже совпадало со временем запланированного возвращения", — уточнил посол.

Г.Литвин отметил, что до конца года не планируется визитов высокопоставленных руководителей Польши в Минск. "Но это не значит, что их не будет", — добавил посол.

Народная Воля http://www.nv-online.info
6 ЛІСТАПАДА 2008 г.

Алег ВОЛЧАК:

«Ніякіх ілюзій наконт дэмакратызацыі Беларусі быць не павінна»

Ёсць такая прафесія — людзей абараняць. Хаця ў сённяшняй Беларусі быць юрыстам ці праваабаронцам не вельмі проста. Асабліва, калі ты спрабуеш рэальна дапамагчы людзям, а не выкарыстоўваеш закон ва ўласных мэтах ці ўвогуле не заўважаеш яго. Калі ты не чакаеш указкі зверху, каб прыняць рашэнне, калі не баішся, што за тваю дзейнасць цябе могуць жорстка збіць ва ўласным пад'ездзе…

Для праваабаронцаў, якія дзесяць гадоў таму заснавалі арганізацыю "Прававая дапамога насельніцтву", абарона інтарэсаў простых людзей нават не прафесія — гэта іх лёс.

Пасля юбілейных урачыстасцяў адзін з заснавальнікаў "Прававой дапамогі насельніцтву" юрыст і праваабаронца Алег Волчак пагутарыў з карэспандэнтам "Народнай волі".

— Алег Канстанцінавіч, давайце пачнём здалёк. У свой час вы працавалі следчым пракуратуры. Што прымусіла адмовіцца ад пагонаў? Чаму вы выбралі для сябе шлях праваабаронцы?

— Як гэта пафасна ні прагучыць, больш за ўсё ў жыцці я не люблю несправядлівасці. Працуючы ў пракуратуры, я свята верыў у тое, што гэты орган сапраўды стаіць на баку абароны правоў грамадзян. Але тое, што гэта не так, я адчуў на ўласным прыкладзе. У сярэдзіне 90-х гадоў мінулага стагоддзя пасля прыходу да ўлады Аляксандра Лукашэнкі ў "моду" ўвайшлі разгоны вулічных акцый апазіцыі, збіццё мірных бяззбройных людзей. На той час я быў дэпутатам Мінскага гарадскога Савета і на адным з пасяджэнняў адкрыта выступіў супраць такіх незаконных дзеянняў у дачыненні да простых людзей. Для мяне не важна, што гэта за людзі — апазіцыянеры ці прыхільнікі ўлады, ці падманутыя ўкладчыкі... Важна, што людзей збівалі, парушаючы закон, гаварыў я тады. Канечне, маё выступленне выклікала рэзананс, у тым ліку і ў пракуратуры. Там мне адкрыта сказалі, што "барацьбітам за праўду" ўзыход па кар'ернай лесвіцы немагчымы. Але нават не гэта галоўнае. Галоўнае, што я тады зразумеў, перад законам у Беларусі роўныя далёка не ўсе... І прыняў адзінае правільнае для сябе рашэнне — сысці з пракуратуры і дапамагаць людзям самастойна, выкарыстоўваючы свае веды.

— Адсюль і нарадзілася ідэя аб стварэнні праваабарончай арганізацыі?

— Так. Арганізацыя "Прававая дапамога насельніцтву" была створана восенню 1998 года. Першапачаткова планавалася, што мы будзем займацца выключна абаронай правоў воінаў-афганцаў. Сярод заснавальнікаў арганізацыі былі воіны-інтэрнацыяналісты, журналісты, выдаўцы, юрысты... Праз нейкі час пасля заснавання арганізацыі мы вырашылі, што спектр пытанняў, які павінен быць на кантролі ў "Прававой дапамогі насельніцтву", павінен быць пашыраны. Мы сталі займацца і сацыяльнымі пытаннямі, аказваючы бясплатную юрыдычную дапамогу людзям. У арганізацыі з'явілася каля 15 рэгіянальных прадстаўніцтваў... На той час ужо існавалі праваабарончыя арганізацыі, такія як "Вясна", "Беларускі Хельсінкскі камітэт", аднак яны займаліся ў асноўным палітычнымі судовымі працэсамі. Таму мы занялі сваю нішу, практыкуючыся на пытаннях сямейнага, працоўнага і грамадзянскага заканадаўства.

— Аўтарытэт любой арганізацыі заключаецца не ў словах яе заснавальнікаў, а ў канкрэтных справах. Што за гэты час удалося зрабіць "Прававой дапамозе насельніцтву"?

— На сённяшні дзень мы рэальна дапамаглі больш чым васьмі тысячам чалавек. Праз "Прававую дапамогу насельніцтву" прайшло каля пяцідзесяці юрыстаў. І калі гаварыць канкрэтна, то на рахунку нашай арганізацыі ёсць дасягненні, можна сказаць маленькія перамогі. Сярод гучных спраў, якімі займалася наша арганізацыя, варта ўзгадаць трагедыю, якая здарылася ў маі 1999 года ў метро "Няміга". Як вы памятаеце, адразу прасля трагедыі чыноўнікамі было заяўлена, што ў даўцы, якая ўтварылася ў пераходзе, вінаваты самі людзі. Аднак нашы юрысты здолелі даказаць, што да трагедыі прывяла халатнасць супрацоўнікаў міліцыі. І органы пракуратуры былі вымушаны з гэтым пагадзіцца.

Не магу таксама не ўзгадаць яшчэ адну гучную справу 1999 года — збіццё супрацоўнікамі АМАПа ўдзельнікаў палітычнай акцыі "Марш свабоды". У міліцэйскіх аўтобусах апынуліся каля шасцідзесяці чалавек. Людзей чатыры гадзіны вазілі па Мінску і жорстка збівалі... Тады прадстаўнікі "Прававой дапамогі насельніцтву" нават устанавілі прозвішчы амапаўцаў, якія збівалі людзей, аднак расследаванне так і не было распачата з той прычыны, што людзі быццам бы збівалі самі сябе...

Увогуле, кожны з юрыстаў нашай арганізацыі можа прывесці процьму канкрэтных прыкладаў па дапамозе людзям, але, на маю думку, найбольш яскрава аб тым, што ў "Прававой дапамогі насельніцтву" быў аўтарытэт у грамадстве, як гэта ні парадаксальна, сведчыць судовае рашэнне аб ліквідацыі арганізацыі...

— Пра тое, што арганізацыю рана ці позна вывядуць з прававога поля шляхам яе ліквідацыі, вы здагадваліся?

— Так. І вось чаму. Уладам, якія на кожным кроку пераступаюць праз закон, вельмі нявыгадна, каб людзі былі юрыдычна граматнымі. Людзі, якія ведаюць, што ў іх ёсць не толькі абавязкі, але і правы, пачынаюць сябе паіншаму паводзіць, адстойваць свае правы. А каму з чыноўнікаў спадабаецца, што ёсць легальна зарэгістраваная і працуючая арганізацыя, якая чапляецца за любыя незаконныя дзеянні афіцыйных асоб...

Нам намякалі, што ў арганізацыі могуць быць праблемы. Нас збівалі. Двойчы быў збіты я, каля свайго пад'езда быў збіты сябра нашай арганізацыі Алег Случак, таксама была збіта адна з заснавальніц арганізацыі Раіса Міхайлоўская. А вось на былога следчага са Жлобіна, які супрацоўнічаў з нашай арганізацыяй, Анатоля Папова правакатары дзейнічалі праз сына. Малодшаму Папову падкінулі наркотыкі... Быў цяжкі працэс, маладога чалавека асудзілі, але нам удалося дабіцца адносна мяккага прысуду. Так ці іначай, запалохаць нас не ўдалося, мы працягвалі сваю працу...

— Што стала фармальнай прычынай для ліквідацыі "Прававой дапамогі насельніцтву"?

— Фармальнай прычынай для закрыцця арганізацыі стаў візіт у наш офіс супрацоўніцы Міністэрства юстыцыі, якая заявіла, што ў яе нашы людзі быццам бы ўзялі грошы за кансультацыю. Гэта, канечне, не так, арганізацыя працавала на дабрачыннай аснове, ніякіх грошай мы не бралі, працавалі бясплатна. Што ў судзе і было даказана. І тады пракурор паставіў нам у віну тое, што мы дапамагалі людзям абсалютна бясплатна, маўляў, мы не мелі на гэта права. Вось такі абсурд тварыўся ў судзе...

Варта адзначыць, што "Прававая дапамога насельніцтву" стала першай незалежнай праваабарончай арганізацыяй, зачыненай у Беларусі.

— Пасля таго, як "Прававую дапамогу насельніцтву", па сутнасці, пакінулі па-за законам, пазбавіўшы магчымасці працаваць, арганізацыя дзейнасць не спыніла…

— Мы не збіраліся спыняцца. Так, апошнія пяць гадоў, якія прайшлі з моманту ліквідацыі "Прававой дапамогі насельніцтву", мы працуем у падполлі. Тады, у 2003 годзе, годзе, які стаў "чорным" для арганізацый так званага трэцяга сектара на судзе па справе аб закрыцці "Прававой дапамогі насельніцтву", я казаў, што юрысты і праваабаронцы будуць працягваць працаваць. Па Канстытуцыі, я як юрыст магу аказваць прававую дапамогу людзям, незалежна ад рашэння суда.

Зараз нашы юрысты працуюць паасобку, бо трапіць пад сумна вядомы артыкул аб дзейнасці ад імя незарэгістраванай арганізацыі ў нашай краіне можа літаральна кожны. Але ў той жа час мы стараемся трымацца разам. Ёсць задумка зноў зарэгістраваць "Прававую дапамогу насельніцтву", праўда, не ў Беларусі, таму што гэта на сённяшні дзень нерэальна і перад вачыма ёсць прыклады незарэгістраванага "Маладога фронту" і руху "За свабоду" ва Украіне. Рэгістрацыя адкрые перад арганізацыяй новыя магчымасці для працы.

— Такім чынам, планаў у "Прававой дапамогі насельніцтву" наперадзе шмат…

— Тут нам і планаваць нічога не трэба. За нас вырашае жыццё, якое ў Беларусі, на вялікі жаль, пагаршаецца. І ў прававым сэнсе таксама. Зараз да нас без перапынку звяртаюцца людзі самых розных прафесій, сацыяльнага статусу і палітычных поглядаў. Іх аб'ядноўвае справа аб выбуху ў Мінску. Людзей хітрасцю і падманам прымушаюць здаваць аналіз сліны, беспадстаўна бяруць у іх адбіткі пальцаў. Мы спрабуем гэтаму супрацьстаяць. Акрамя таго, апошнім часам да нас звяртаюцца маладыя людзі, якія расказваюць пра спробы іхняй вярбоўкі з боку спецслужб. Тут мы таксама будзем дапамагаць. Зразумела, мы не пакінем у баку праблему воінаў-афганцаў, якія дагэтуль не маюць ільгот.

Акрамя таго, на бліжэйшыя шэсць месяцаў наша дзейнасць будзе скарэкціравана. Патлумачу чаму. Як вядома, Еўрасаюз роўна на шэсць месяцаў зняў візавыя абмежаванні для Аляксандра Лукашэнкі і некаторых людзей з ягонага атачэння. Дзіўна, асабліва, калі ведаеш, што беззаконне пануе ў Беларусі. Таму перад Еўропай мы будзем уздымаць гэтую праблему. Датуль, пакуль "Народная воля" будзе вымушана друкавацца ў Смаленску, датуль, пакуль у Беларусі не спыняць пераслед праваабаронцаў, як гэта робяць з Янай Паляковай, датуль, пакуль не будуць аб'ектыўна расследаваны справы зніклых палітыкаў, датуль, пакуль з Крымінальнага кодэкса Беларусі не будзе выкраслены артыкул, які прадугледжвае пакаранне за дзейнасць ад імя незарэгістраванай арганізацыі, ніякіх ілюзій наконт дэмакратызацыі ўнутры Беларусі быць не павінна...

Віталь ГАРБУЗАЎ.
Фота Юрыя ДЗЯДЗІНКІНА.

ТАК І СКАЗАЎ!

Зянон Пазьняк сцвярджае, што на мяжы ў яго будуць «страляць на паражэнне»

Юбілейныя, 20-я, "Дзяды" зноў прайшлі без Зянона Пазьняка? Ці збіраецца Зянон Станіслававіч вяртацца ў Беларусь?

"Гэтая думка ў мяне існуе пастаянна, — адказаў Зянон Пазьняк у інтэрв'ю "Еўрарадыё". — Уся мая праца, уся мая работа накіраваная на тое, каб гэты час прыспешыць. Я, дарэчы, прыязджаў ужо ў Беларусь. У 1996 годзе 26 красавіка, праз месяц пасля эміграцыі. Гэта была проста дэтэктыўная гісторыя, як мне ўдалося праехаць праз мяжу. На мітынгу я быў. Я быў з аховай, бо ўжо ведаў, што мяне будуць браць пасля мітынгу. Закончылася гэта штурмам. Мы забарыкадзіраваліся ў Сядзібе, нас акружылі і потым штурмавалі. Але ж мне ўдалося выйсці з гэтага становішча. Пасля я яшчэ два тыдні быў у падполлі ў Мінску, а потым перабраўся ва Украіну, затым у Чэхію і гэтак далей. Так што прыезд ужо быў. Ён дакладна паказаў, што будзе. Мне ехаць цераз гэтую мяжу — раўназначна самагубству, таму што я ведаю дакладна тыя распараджэнні, якія ідуць асабіста ад Лукашэнкі. Яны гучаць так: пры непадпарадкаванні і аказанні супраціўлення страляць на паражэнне. Так што ўсе тыя размовы: вернецца, не вернецца — альбо такое інфантыльнае аматарства, альбо гэта свядома робяць людзі з правакацыйнымі мэтамі, каб у людзей, якія не вельмі разбіраюцца, пасеяць дрэннае ўражанне пра чалавека. Вось ён тут не вяртаецца... Узяў бы і вярнуўся".

ПАЛІТКУХНЯ

Мікола СТАТКЕВІЧ: «Нас папросту "кінулі"…»

Днямі стала вядома, што каардынацыйны камітэт "Еўрапейскай кааліцыі" пад старшынствам Міколы Статкевіча зацвердзіў рашэнне аб выхадзе арганізацыі з дамоўленасці аб стварэнні Аб'яднаных дэмакратычных сіл.

Прычыны такога кроку Мікола Статкевіч растлумачыў у гутарцы з карэспандэнтам "Народнай волі": "Нагадаю, што АДС былі створаны праз дамоўленасць "Еўрапейскай кааліцыі" і тагачаснай "Пяцёркай+", — нагадаў Статкевіч. — Базавымі прынцыпамі гэтай дамовы былі еўрапейская інтэграцыя Беларусі, роўнасць суб'ектаў і дэмакратычнасць прымаемых рашэнняў унутры структуры. Але неўзабаве пасля гэтага "Еўрапейская кааліцыя" апынулася пад прэсінгам улады — юрыдычнымі і крымінальнымі рэпрэсіямі. Варта нагадаць прысуды ў дачыненні да Паўла Севярынца, які быў кінуты на "хімію" на 2 гады, Зміцера Дашкевіча, які быў кінуты за краты на 1,5 года... На "хіміі", як вы памятаеце, быў і я. Безумоўна, праз гэтыя рэпрэсіі актыўнасць сябраў "Еўрапейскай кааліцыі" ў АДС зменшылася. Нашыя партнёры скарысталіся гэтым і зусім забыліся пра нас. Калі хочаце, нас папросту кінулі, адмовіўшыся ад прынцыпаў, на якіх фарміраваліся АДС. Ці варта казаць, што на мінулагодні кангрэс АДС дэлегаты вылучаліся абсалютна непразрыстым чынам? У выніку, у кіруючых органах АДС апынуліся людзі, якія ігнаруюць прынцыпы "Еўрапейскай кааліцыі". У знак пратэсту мы вывелі ўсіх сваіх сябраў з кіруючых органаў АДС. І на парламенцкія выбары мы пайшлі асобным спісам у тым ліку з-за таго, што прапановы "Еўрапейскай кааліцыі" былі праігнараваны тымі, хто кіруе АДС. Комплекс усіх гэтых непаразуменняў і прымусіў "Еўрапейскую кааліцыю" прыняць рашэнне аб выхадзе арганізацыі з дамоўленасці аб стварэнні Аб'яднаных дэмакратычных сіл".

Ці дасць гэта плён пашырэнню дэмакратыі ў краіне — пытанне рытарычнае.

Віталь ГАРБУЗАЎ.

ГРОМКОЕ ДЕЛО

Евгения Шигалова отправили в эмиграцию

Председатель Совета директоров Торгового дома "Ждановичи" Евгений Шигалов уехал из Беларуси.

Такую новость со ссылкой на "очень осведомленных людей" на днях принесли в редакцию.

"Народная воля" решила проверить эту информацию.

"Кому-то, наверное, очень хочется, чтобы Евгений Александрович эмигрировал, — сказали "Народной воле" родственники известного бизнесмена. *— Он никуда не уехал, живет в Беларуси, как и раньше. Не так давно, правда, ездил в Лондон — на консультацию к врачам и очередное обследование. Доктора снова пришли к выводу, что операцию на сердце ему сейчас делать нельзя и прописали медикаментозное лечение почти на полгода".*

Уголовное дело в отношении Шигалова пока не закрыто.

В ТЕМУ

После операции — в СИЗО

До сих пор за решеткой находится еще один фигурант "дела Шигалова" — директор Торгового дома "Ждановичи" Александр Ралько.

Он сидит в СИЗО с 29 апреля. Его обвиняют в превышении служебных полномочий.

Еще пару месяцев назад было известно, что у Ралько — серьезные проблемы со щитовидной железой. Медики настаивали на хирургическом вмешательстве. Александру Александровичу даже предлагали сделать операцию на щитовидке в тюремной больнице, однако он отказался...

Как стало известно "Народной воле", супруга А.Ралько настояла на том, чтобы операцию сделали в 10-й городской больнице. Там директор Торгового дома "Ждановичи" находился под конвоем. Через несколько дней после операции Ралько перевели в тюремную больницу. Сейчас он снова в СИЗО на Володарского.

Как рассказали "Народной воле" знакомые Ралько, все ходатайства об освобождении Ралько под залог или под подписку о невыезде пока остаются без удовлетворения.

"И это при том, что чиновники из МВД говорят, что надо чаще применять практику освобождения под залог, — говорят знакомые Ралько. — Но если уже Шигалов не скрылся за границей, а вернулся в Беларусь из Англии, то куда денется Ралько?.."

ОФИЦИАЛЬНО

В конце сентября министр внутренних дел Беларуси Владимир Наумов заявил, что следствие по делу Е.Шигалова может быть завершено в январе 2009 года. Затем МВД будет готово направить материалы дела в суд.

Как отметил Наумов, "большая часть работы по документированию той преступной деятельности, которая имела место, уже сделана".

Для справки: Шигалов был задержан 5 апреля 2008 года, арестован — 7 апреля. 15 апреля ему было предъявлено обвинение в злоупотреблении служебными полномочиями, повлекшим причинение тяжких последствий в виде ущерба экологической среде.

Еще до ареста Е.Шигалов дважды перенес инфаркт миокарда, операцию на сердце, которую выполнили лондонские медики.

В СИЗО у Шигалова случился третий инфаркт.

26 июня он был освобожден из-под стражи под залог в 10 миллиардов белорусских рублей. Через некоторое время после освобождения Шигалов отправился на консультацию к английским докторам.

Вернувшись в Беларусь, он получил удостоверение II второй нерабочей группы.

Марина КОКТЫШ.

ДЫПКУР'ЕР

Польшча знізіла кошт нацыянальных віз для беларусаў

Міністэрства замежных спраў Польшчы прыняло пастанову, згодна з якой кошт афармлення нацыянальнай візы (не блытаць з шэнгенскай, афармленай у польскай амбасадзе) будзе каштаваць 20 еўра замест ранейшых 35 еўра.

Рашэнне ўступае ў сілу ўжо з 1 лістапада. Зніжэнне кошту віз тлумачыцца матэрыяльным станам беларусаў і вынікаючымі адсюль цяжкасцямі ў аплаце візы.

ТРАГЕДЫЯ

Забойства без вінаватых?

29 кастрычніка зрабілася жалобным днём для наваполацкай сярэдняй школы №4: настаўнікі разам з вучнямі і бацькамі сваіх выхаванцаў бралі ўдзел у пахаванні 9-гадовай навучэнкі 4-га класа Паліны Снімшчыкавай, якая загінула ад рукі ўласнай маці.

Смерць дзяўчынкі наступіла ў выніку шматлікіх удараў нажом.

Забойца, 33-гадовая жанчына, нарадзіла Паліну па-за шлюбам і гадавала адна, з дапамогай сваёй маці.

"Біялагічны" бацька нябожчыцы, Ігар Снімшчыкаў, які нядаўна "знайшоўся", нібыта не адмаўляецца ад свайго бацькоўства і прысутнічаў на пахаванні дачкі. Праўда, маці Паліны пры яе нараджэнні запісала імя па бацьку не "Ігараўна", а "Паўлаўна".

Паводле цьмяных гутарак, Паўлам зваўся нейкі верхавод вычварнай секты, дзе маці Паліны знаходзілася некалькі год і вымушана была, як і ўсе іншыя маладзіцы, сужыцельствацаць з кіраўніком. Такім чынам, не выключана, што сапраўдным бацькам забітай дзяўчынкі быў менавіта сектант Павел.

Як бы там ні было, а Паліна, выгадаваная без бацькі, вырасла прыгожай, добрасардэчнай і таленавітай, з вялікімі здольнасцямі да спеваў і танцаў.

Да нядаўняга часу нішто ў адносінах дачкі і маці не выклікала трывогі. Маці прыходзіла на ўсе школьныя канцэрты, дзе выступала дачка, а потым праводзіла Паліну дадому.

Але гады, праведзеныя ў секце, адбіліся, магчыма, на душэўным стане жанчыны. У сёлетнім верасні яе маці заявіла ў міліцыю, а затым — і ў паліклініку, што яе дачка паводзіць сябе ненармальна, раз-пораз кідаецца на яе з нажом. Тады маці Паліны была агледжана ўрачамі і тэрмінова змешчана ў стацыянар Полацкай псіхіятрычнай бальніцы.

Па факце забойства ўзбуджана крымінальная справа. Забойца патлумачыла следчаму, што пачула нейкі голас, які загадаў ёй узяць нож і зарэзаць дачку.

На думку медыкаў, маці Паліны Снімшчыкавай пакутуе цяжкай формай шызафрэніі, а таму прад'явіць ёй абвінавачанне будзе немагчыма.

У стане, блізкім да роспачы, знаходзіцца дырэктар школы №4 Вольга Назарава: і дзяўчынку шкада, і за сябе страшна. У смерці навучэнкі могуць абвінаваціць адміністрацыю школы (не даглядзелі, маўляў), і кіраўніца тады пазбавіцца працы за два гады да пенсіі.

Сяргей БУТКЕВІЧ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
6 ЛІСТАПАДА 2008 г.

Цэны — уверх, бюджэт пражытачнага мінімуму — уніз

1 лістапада ў Беларусі ўвайшоў у дзеянне новы памер бюджэту пражытачнага мінімуму.

Як паведаміла прэс-служба ўрада, бюджэт пражытачнага мінімуму (БПМ) у сярэднім на душу насельніцтва з лістапада складзе 223 тыс. 660 рублёў. Тым часам, як з 1 жніўня па 31 кастрычніка гэты нарматыў быў роўны 224 тыс. 700 рублёў). Для працаздольнага насельніцтва БПМ устаноўлены ў памеры 245 тыс. 270 рублёў, для пенсіянераў — 195 тыс. 780 рублёў, для студэнтаў — 233 тыс. 870 рублёў, для дзяцей ва ўзросце ад 3 да 16 гадоў — 265 тыс. 100 рублёў, для дзяцей ва ўзросце да 3 гадоў — 191 тыс. 470 рублёў.

Такім чынам, БПМ паменшыўся на 900 рублёў. Пры тым росце цэн, які назіраецца ў краіне, проста немагчыма патлумачыць, якім чынам трэба было весці разлікі, каб БПМ паменшыўся.

Самы высокі сярэдні заробак у Мінску, самы нізкі — на Брэстчыне

Намінальная налічаная сярэднямесячная заработная плата работнікаў Беларусі ў студзені-верасні гэтага года склала 857 тысяч рублёў, у тым ліку ў верасні — амаль 943 тысячы. Як паведамілі БЕЛТА ў Нацыянальным статыстычным камітэце, самы высокі сярэдні заробак у верасні быў у Мінску (1 мільён 232 тысячы), самы нізкі — у Брэсцкай вобласці (818 тысяч).

«Альфа-банк» закрывае прадстаўніцтва ў Беларусі

На гэтым тыдні кіраўніцтва "Альфа-банка" (Украіна), які ўваходзіць у групу найбуйнейшых, на пасяджэнні вырашыла ліквідаваць прадстаўніцтва ў Беларусі.

Дадзенае прадстаўніцтва будзе ліквідавана ў сувязі з адсутнасцю неабходнасці наступнага функцыянавання, паведамілі "Украінскія навіны".

Якую крамолу знайшлі ў Arche?

10 асобнікаў апошняга нумара беларускага недзяржаўнага часопіса Arche канфіскавалі брэсцкія мытнікі. Іх везлі супрацоўнікі рэдакцыі для польскіх аўтараў выдання і для перадачы ў бібліятэкі Польшчы. Супрацоўніца мытні Рэната Нядбаева западозрыла, што "звесткі, надрукаваныя ў часопісе, могуць шкодзіць нацыянальным інтарэсам Рэспублікі Беларусь".

Нумары Arche канфіскоўвалі на мяжы і раней, але звычайна пасля прапаноўвалі прыехаць і іх забраць. Цяпер жа адбылася рэкордная, прынамсі па вазе, канфіскацыя. Справа ў тым, што кожны нумар часопіса мае 1082 старонкі і важыць каля кілаграма. Мытнікі адправяць "здабычу" на экспертызу.

У Пінску пачаўся суд над вычварэнцам-«доктарам»

Суд над 40-гадовым вычварэнцам пачаўся ў Пінску. Ён дзейнічаў пад выглядам доктара. У адсутнасць дарослых мужчына заходзіў у кватэры і праводзіў "медагляд" дзяцей.

Бацькі спачатку не верылі сваім дзецям, калі яны распавядалі пра такія выпадкі. Аднак некаторыя ўсё ж аднеслі заявы ў міліцыю. У хуткім часе адна з ахвяраў пазнала "доктара" ў прадуктовай краме, і міліцыянты яго затрымалі. Як высветлілася, гэта быў даволі вядомы ў горадзе чалавек, які працаваў ва ўстанове культуры. Раней ён ужо быў асуджаны за падобныя дзеянні.

Праведзеная экспертыза не знайшла ніякіх псіхічных адхіленняў у злачынцы, і яго чакае тэрмін да 5 гадоў турмы.

У Гродне разбіраюць мост праз Нёман, яго перанясуць у Слуцк

Пантонны мост у Гродне праз Нёман прастаяў амаль год. Яго сабралі, каб людзі хадзілі з аднаго берага на другі падчас рэканструкцыі стогадовага Старога моста.

Вайскоўцы атрымалі заданне разабраць яго за чатыры дні і адвезці назад у Слуцк. Дарэчы, зроблены ён у 1956 годзе, каб перапраўляць цягнікі, важыць мост амаль 200 тон. Для пераходу людзей яго прыстасавалі ўпершыню: дэмантавалі рэйкі і зрабілі насціл з дошак. Гэтая схема ўнікальная для Беларусі.

ДЗЯДЫ, ДЗЯДЫ, БУДЗЬЦЕ З НАМІ!

Мы чуем іх галасы — галасы нашага сумлення

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Урачыстая калона паломнікаў, на пачатку шляху, па праўдзе, не надта шматлікая, пры ўваходзе на тэрыторыю Народнага мемарыяла вырасла ў некалькі разоў. Бачу мноства знаёмых твараў. Вось вядомы мастак **Алесь Пушкін** з Крупак нясе сваё новае палатно — выдатны партрэт рэпрэсаванага святара. Ну, а без **Маі Тодараўны Кляшторнай** — дачкі расстралянага ў Курапатах паэта Тодара Кляшторнага — Курапаты наогул не ўявіць.

Даўняя і надзейная сяброўка "Народнай волі" са Смалявічаў **Зоя Дзмітрыеўна Іванова**, даведаўшыся пра "Дзяды" ў Мінску з любімай газеты, прыехала не адна, а яшчэ з адным прыхільнікам і аўтарам газеты **Уладзімірам Рыгоравічам Бацяноўскім**, каб пабачыць усё на ўласныя вочы. Ззяюць радасцю: колькі ж моладзі побач з людзьмі старэйшага веку, абсалютная большасць!

Мора бел-чырвона-белых сцягоў, кветак на свяшчэннай зямлі, палітай кроўю тысяч бязвінных ахвяр... Не, цяжка пагадзіцца са сцвярджэннем, што крыжовы шлях на Курапаты аказаўся забытым. Ён стаў насамрэч складнікам духоўнага жыцця тых беларусаў, якім дарагая Бацькаўшчына і яе будучыня. І гэта адчуеш не толькі ў такія ўрачыстыя дні ці калі зрэдку наведваешся сюды, а калі зрастаешся з гэтай мясцінай душой і сэрцам. Калі працуеш штотыдзень разам з курапацкімі талакоўцамі — самымі рознымі людзьмі — на добраўпарадкаванні ўрочышча, то ўпэўніваешся: яно не забытае. Калі забытае, дык уладамі, а не людзьмі гонару і сумлення.

Вось хаця б некалькі сустрэч апошняга часу. Бачу — па крыжовай дарозе на курапацкі пагорак узнімаецца невялікая, але ўрачыстая працэсія з крыжом на мужчынскіх плячах. Тут і жанчыны рознага веку, і дзеці: родныя і сваякі, што сабраліся з розных мясцін, каб увекавечыць імянным крыжом памяць без віны кінутага на смерць у 1938-м 20-гадовага настаўніка Антона Ліхадзіеўскага... Імянных крыжоў усё более і более, на некаторых — цэлыя сямейныя спісы.

...Ускатваюць на пагорак свае веласіпеды юныя аматары вандровак па родным краі са сваім школьным настаўнікам, слухаюць яго аповед. Курапаты — у іх планавым маршруце.

Гасцям са Швецыі — групе інвалідаў-калясачнікаў — узбірацца на такую вышыню няпроста, але яны ўпарта робяць гэта. Пабываць у Беларусі і абмінуць трагічную мясціну — сведчанне злачынстваў таталітарызму — цывілізаванаму чалавеку проста немагчыма.

Падарожнік з другога зямнога паўшар'я, лацінаамерыканскай краіны Балівіі таксама ведае пра Курапаты, але просіць расказаць як мага болей... Турысты з Польшчы — яны бываюць тут часта — пакідаюць ля крыжоў знічы і гірлянды кветак. На іх часам квапяцца рознага кшталту падонкі-вандалы, разбіваюць лампадкі, ламаюць крыжы. Незадоўга перад "Дзядамі" і ў ноч на свята гэтыя падшыванцы — падобна, кімсьці скіраваныя — зноў разбушаваліся. Апошніх курапацкім валанцёрам удалося схапіць і здаць у міліцыю: па фатаграфіях у інтэрнеце "герояў", якія павінны быць пакараны па законе, могуць апазнаць знаёмыя і ацаніць іх "подзвігі".

А крыжы паўсталі зноў, да іх дабавіліся новыя, прынесеныя ўдзельнікамі шэсця. Лес крыжоў расце і расце на месцы народнай пакуты і згубы — сімвалам нашай Памяці і сумлення. Іх ужо не скрышыць, як бы таго каму ні хацелася.

Не, не "вузкапартыйным мерапрыемствам", а народнай акцыяй былі "Дзяды" ў Курапатах пад эгідай Кансерватыўна-Хрысціянскай партыі, якая ўзяла на сябе ганаровы цяжар і адказнасць за стварэнне Народнага мемарыяла ў месцы масавых расстрэлаў 1937—1941 гадоў і няўхільна выконвае свой доўг перад памяццю продкаў з падтрымкай шырокай грамадскасці. На жаль, самі сябе ізалявалі ад высокай народнай традыцыі многія апазіцыйныя дзеячы.

З актывістаў іншых партый, якія называюць сябе дэмакратычнымі, за выключэннем купкі з Партыі БНФ на чале з **Лявонам Баршчэўскім, Вінцуком Вячоркам** і **Віктарам Івашкевічам**, лідэра Аб'яднанай грамадзянскай партыі **Анатоля Лябедзькі**, лідэраў маладзёжнага руху **Паўла Севярынца, Артура Фіньковіча, Зміцера Дашкевіча,** палітыка **Аляксея Караля** мала хто далучыўся да народнага шэсця. Горка і сорамна, панове-абывацелі!

...Самым уражлівым, радасна-нечаканым быў момант, калі незнаёмыя маладзёны разгарнулі і панеслі па Крыжовай курапацкай сцяжыне агромністае, метраў на дваццаць даўжынёй, бел-чырвона-белае палотнішча — сімвал пакутніцкай крыві Хрыста на плашчаніцы. Дзесяткі людзей падхапілі сцяг, і гэта было шчасце — дакрануцца да яго, патрымаць і падтрымаць.

— Хлопцы дарагія, хто ж вы, адкуль узяліся?

— Ды проста — беларусы з Беларусі! — коратка адказаў за ўсіх юны прыгажун з асляпляльнай усмешкай.

Паўстае такая моладзь - паўстае надзея: будзем жыць! Раскацістае "Жыве Беларусь!" лунала ў курапацкім паветры, яднала людзей у адно, рабіла іх больш чуйнымі да галасоў крыжоў і ўласнага сумлення.

Мітынг у лясным урочышчы, на якім зачытвалася віншаванне землякам са Святымі Дзядамі "Дзяды, дзяды, будзьце з намі!" ад Зянона Пазьняка — лідэра Кансерватыўна-Хрысціянскай партыі — і ўсхвалявана прамаўлялі намеснікі старшыні **Юры Беленькі, Валеры Буйвал, Сяргей Папкоў**, паэт **Генадзь Тумаш**, завяршыўся спевам нацыянальнага гімна "Магутны Божа". Людзі доўга не хацелі разыходзіцца. Усцілалі кветкамі магілы, ставілі свечкі, аздаблялі абраз Маці Божай Курапацкай. А вясной тут успыхнуць цюльпаны — клубні кветак пераслала курапацкім валанцёрам чытачка "Народнай волі" з Гомеля **Святлана Міхайлаўна Піласевіч**, і мы іх пасадзілі...

У ранніх прыцемках чырвоныя агеньчыкі знічак на перакладзінах крыжоў стварылі незабыўнае відовішча: гэта свяціліся душы закатаваных, бязгучна размаўлялі з намі. Дзяды чулі нас, а мы іх. Значыць, тое, аб чым яны шэпчуць, іх нашчадкам наканавана зрабіць явай...

— Так хораша, так светла і гожа на "Дзяды" яшчэ не было! — выказала сваё ўражанне шчырая руплівіца курапацкіх талокаў **Аліна Дуброўская** з Дзяржынска.

Далучаюся цалкам і поўнасцю.

Святлана КЛІМЕНЦЕНКА.
Фота Юрыя ДЗЯДЗІНКІНА.

ПАЛІТЫКА

Хрысціяне-дэмакраты хочуць ісці на прэзідэнцкія выбары ў якасці партыі

Аргкамітэт па стварэнні грамадскага аб'яднання "Беларуская хрысціянская дэмакратыя" (БХД) працягне дзейнасць па рэгістрацыі арганізацыі. Аб гэтым паведаміў БелаПАН адзін з каардынатараў аргкамітэта Павел Севярынец перад пачаткам навукова-практычнай канферэнцыі "Хрысціянская дэмакратыя і беларускі рух", якая 1 лістапада зладжана ў Мінску ў штаб-кватэры Партыі БНФ і прысвечана 81-м угодкам з дня ўзнікнення "Беларускай хрысціянскай дэмакратыі".

Паводле слоў П.Севярынца, 1 сакавіка 2009 г. мае адбыцца ўстаноўчы з'езд палітычнай партыі "Беларуская хрысціянская дэмакратыя". Партыя, адзначыў палітык, ставіць перад сабою амбітныя планы — або вылучэнне на прэзідэнцкіх выбарах 2011 г. свайго кандыдата, або падтрымка найбольш "уплывовага і рэальнага" кандыдата ў прэзідэнты ад апазіцыі. Перад пачаткам канферэнцыі адбыўся сход аргкамітэта Партыі "БХД", на якім прайшло рэйтынгавае галасаванне з нагоды магчымага прэтэндэнта ў кандыдаты на прэзідэнцкую пасаду, якога падтрымае БХД. Першае месца атрымаў пакуль гіпатэтычны кандыдат ад БХД, другое — лідэр руху "За Свабоду" Аляксандр Мілінкевіч. Як адзначыў П.Севярынец, БХД вядзе свой пачатак ад хрысціянскай партыі, створанай у Беларусі яшчэ падчас Першай сусветнай вайны. Гэта тая партыя, нагадаў ён, якая была найбольш уплывовай у Заходняй Беларусі і якая аб'ядноўвала членаў розных рэлігійных поглядаў — каталікоў, праваслаўных, пратэстантаў.

РОЗДУМ

Песні спяваць і поле араць

Зусім было сабраўся пісаць успаміны пра незабыўныя падзеі "Дзядоў-88", пра пачуццё акрыленасці, пах свабоды, народжаныя паўстаннем Беларускага народнага фронту "Адраджэньне". Але трапіўся мне ў рукі нумар "Народнай волі" за 23 кастрычніка з артыкулам З.Пазьняка "Гэта магутная песня ў жыцці нацыі", і я зразумеў, што так праспяваць песню, як Зянон Станіслававіч, я не ў стане. І што больш карысным для гісторыі і для новага пакалення дэмакратычна настроеных беларусаў будзе паразважаць над памылкамі, якія перашкодзілі нам жыць ужо сёння ў свабоднай і квітнеючай краіне. Тым больш што пры канцы артыкула З.Пазьняка знайшоў я спасылку на сваё прозвішча і выказванне ці то 1999 г., ці 2001 г.: "нацыянальна-вызвольная ідэя, якая была стрыжнем у дзейнасці БНФ з канца 80-х гг., у значнай ступені вычарпала сябе... Аптымальна было б не падзяляць Фронт, а аб'яднаць яго з Аб'яднанай грамадзянскай партыяй і іншымі партыямі гэтага накірунку".

Праўда, вярнуўшыся да пачатку артыкула, я знайшоў словы самога Пазьняка: *"Пасля ліквідацыі СССР і КПСС пратэстны антыкамуністычны і антыкаланіяльны ўздым скончыўся"*. І зразумеў, што думаем мы аднолькава, толькі сённяшнюю сітуацыю бачым па-рознаму. Зянон Станіслававіч на апошнім агульным з'ездзе БНФ у 1997 годзе дамогся абвяшчэння стварэння нацыянальна-вызвольнага руху. А я і тады і зараз лічу гэтую ідэю памылкай. Калі сапраўды патрэбны такі рух, то як можна пісаць: *"Тое, што сталася вечарам 25 жніўня 1991 года, — гэта найвялікшая выніковая падзея ў гісторыі Беларусі за апошнія 200 акупацыйных гадоў. Беларусь дамаглася рэальнай незалежнасці"?* Ці мы яе ўжо згубілі? А калі ёсць рэальная незалежнасць, то як можна ствараць нацыянальна-вызвольны рух? Супраць аўтарытарнага прамаскоўскага рэжыму трэба ствараць і ўмацоўваць шырокі дэмакратычны рух, не ставячы пад сумнеў такую каштоўнасць, як незалежнасць краіны.

Фактычна спрэчка ў нас вялася і вядзецца вакол вядомай дылемы. *"Хто не з намі — той супраць нас"?* Ці *"хто не супраць нас — той з намі"?* З.Пазьняк і створаная ім недзеяздольная структура КХП-БНФ — прыхільнікі першай формулы. А БНФ "Адраджэньне", а не толькі Ю.Хадыка, — другой. Хваравітае імкненне лічыць сябе бязгрэшным прывяло паважанага аўтара ў стан ізаляцыі і пустога рэзанёрства. Дзеля адраджэння былога сяброўства і аднадумства, а таксама забеспячэння *"другога прышэсця Народнага Фронту"* вельмі карысна азірнуцца і зразумець, што і чаму было зроблена памылкова ў першым прышэсці.

25 жніўня 1991 года з раніцы на плошчы Леніна (цяпер — Незалежнасці) віраваў шматтысячны бестэрміновы мітынг. Я кіраваў ім. Недзе каля трох гадзін дня паступіла інфармацыя, што будынак ЦК КПБ пакінуты гаспадарамі і клеркі паляць там дакументы. Я паслаў запіску ў залу пасяджэнняў Вярхоўнага Савета, які разглядаў пытанне аб забароне КПБ. На мой запыт, ці трэба займаць будынак ЦК КПБ, Пазьняк адказаў адмоўна. З пункту погляду сённяшняга Пазьняка, гэта — памылка. Бо ён піша: *"...у пачатку 90-х быў толькі адзін спосаб — улада ў Беларусі мусіла належаць Народнаму Фронту"*. Але ж тады і сёння таксама ён разумеў, што *"...грамадства, прыдушанае векавымі рэпрэсіямі, вынішчанае бальшавіцкім генацыдам і камуністычнай прапагандай, не паспявала за ідэйнымі пераменамі, дрэнна арыентавалася і не зусім разумела сутнасць і неабходнасць дзяржаўнага нацыянальнага развіцця"*. Я таксама разумеў гэта і разумеў, што гвалтоўны захоп улады не прынясе Беларусі нічога добрага, таму выканаў рашэнне дэпутацкай фракцыі БНФ і замест захопу ЦК КПБ наладзіў блазнёрскае пахаванне *"Славы Капээсэ"*. Моладзь з папяровую труною прадэфіліравала па вуліцы Карла Маркса да дома №38.

Значна больш грубая памылка была зроблена ў кастрычніку 1992 года, калі Вярхоўны Савет, які меў права толькі прызначыць дату правядзення рэферэндуму, забараніў яго пад ціскам дэпутатаў Д.Булахава, В.Ганчара і А.Лукашэнкі і падтрымаўшага іх старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета С.Шушкевіча. На рэферэндум выносілася пытанне аб спыненні паўнамоцтваў Вярхоўнага Савета 12-га склікання і правядзенні датэрміновых выбараў новага ВС па выбарчым законе, які распрацавалі У.Анцулевіч, Г.Сямдзянава і В.Чуйко. Закон уводзіў мажарытарна-прапарцыянальную сістэму і быў надрукаваны ў цэнтральнай прэсе яшчэ ў сакавіку 1992 года. За рэферэндум падпісалася звыш 440 тысяч выбаршчыкаў па ўсёй краіне, подпісы якіх былі прызнаныя сапраўднымі ЦВК на чале з В.Ціхінем.

